ДУА «ЕЛКАЎСКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА»

# РЭХА ШКОЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ

Агульнашкольная газета Студзень 2021 Выпуск № 5

**Звярніце увагу:**

- Акцыя “Нашы дзеці”
- Валанцёрскі рух “Добрае сэрца”

**У гэтым нумары:**


| | |
|---|---|
| Час добрых спраў | 1 |
| Ветэран жыве побач | 2 |
| Народны каляндар. Студзень | 3 |
| Народны каляндар. Студзень | 4 |


## Час добрых спраў

Новы год – асаблівае свята, якое дзеці і дарослыя чакаюць з аднолькавым нецярпеннем і радаснымі спадзяваннямі. Рознакаляровыя агеньчыкі на вуліцах, зімовыя ўзоры на вокнах дамоў, гірлянды на ўпрыгожаных ялінках – усё нагадвае пра чароўную пару цудаў і падарункаў. І ўжо чвэрць стагоддзя навагодняя акцыя “Нашы дзеці” падтрымлівае святочную атмасферу і працягвае радаваць маленькіх беларусаў. Гэтым разам дабрачынны марафон пачаўся 10 снежня мінулага года і прадоўжыся да 10 студзеня сёлетняга.



У Зэльвеснкім раёне прадстаўнікі мясцовай улады, грамадскіх аб’яднанняў, прадпрыемстваў і арганізацый паклапаціліся, каб ніхто з дзяцей не застаўся без увагі. Асабліва гэта датычыцца тых хлопчыкаў і дзяўчынак, якія па волі лёсу апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі.



Не засталіся ў старане і вучні нашай школы. Дэпутат Маладзёжнага Парламента Атрошанка Дзяніс павіншаваў і ўручыў падарунак Рында В. Вучні і настаўнікі павіншавалі таксама дзяцей-інвалідаў Шкраба Арцёма і Туяхаву Дар’ю са святамі.

Аўтар: Макей Валерыя, 7 клас

## Ветэран жыве побач

Пад эгідай валанцёрскага руху “Добрае сэрца” стартавала акцыя грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі” “Ветэран жыве побач”. У яе межах актывісты раённай арганізацыі ПА АА “БРСМ” — вучні школы наведваюць па месцы жыхарства ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, адзінока. Рабяты аказваюць ім дапамогу па хатняй гаспадарцы, добраўпарадкоўваюць прыдамавыя тэрыторыі, з інтарэсам слухаюць расказы аб ваенным і працоўным мінулым ветэранаў.

Не заставила доўга сябе чакаць самая сапраўдная зіма. Зразумела, адзінока пражываючым сталым людзям часам складана убраць снег, таму на дапамогу прышлі нашы валанцёры.

Аўтар: Макей Валерыя, 7 клас





## Народны каляндар. Студзень

Назва адпавядае характару першага месяца: студзень — значыць, сцюдзёны. У гэты час на зямлю звычайна прыходзілі моцныя халады. Па ім нашы продкі вызначалі, якім меўся быць набытак: «Студзень пагодны — год будзе плодны.



**1 студзеня**. У гэты дзень адзначаюць Новы год. Упершыню Вялікае Княства Літоўскае перайшло на студзеньскі стыль у 1550 годзе.

**6 студзеня**. У праваслаўных — посная куцця. Перадкалядная вячэра. У каталікоў — Тры Каралі. Назва свята «Тры Каралі» — народная, тэалагічная назва — Аб’яўленне Пана. Каталіцкі Касцёл падкрэслівае універсальнасць місіі Хрыста, яе скіраванасць да кожнага чалавека. Найважнейшы сэнс свята ў тым, што Хрыстос ад самага пачатку свайго зямнога жыцця аб’явіўся як Збаўца ўсяго свету. У гэты дзень асвячаецца крэйда, якой каталікі штогод пазначаюць дзверы сваіх дамоў крыжыкамі і імёнамі трох каралёў, напрыклад, К+М+Б (Каспер, Мельхіёр, Бальтазар) або С+М+В (па-лацінску), і ставяць дату ад нараджэння Хрыста, тым самым аддаючы дом і ўсю сям’ю ўладзе і апецы Пана на ўвесь будучы год. Даўней, напярэдадні свята, усе дамы, пазначаныя крыжыкамі і імёнамі трох каралёў, абыходзілі калядоўшчыкі, апранутыя ў экзатычныя «усходнія» шаты. Адзін з «каралёў» чарніў сабе твар, бо паводле падання адзін з іх быў чарнаскуры. Як і «звычайныя» калядоўшчыкі, «мудрацы» спявалі традыцыйныя калядкі, а ўзамен атрымлівалі ад гаспадароў пачастунак. Традыцыйна, у гэты дзень каталікі ва ўсім свеце пяклі рознае печыва, найчасцей — пірагі, торты.

**7 студзеня**. У праваслаўных — Ражаство Хрыстова. Пасля шматтыднёвага посту прадстаўляецца доўгачаканая магчымасць паесці ўволю скаромнага. У народным святочным календары беларусаў пачынаюцца Каляды. Здавён з гэтага дня па сялу пачыналі хадзіць калядоўшчыкі. Пераапранутыя ў цыганоў, казу, жорава, яны заходзілі ў хаты да гаспадароў, спявалі песні, скакалі пад скрыпку і бубен, выказвалі шчодрыя пажаданні. За гэта калядоўшчыкі атрымлівалі пачастункі, грошы. На працягу ўсіх Каляд нельга было нічога ні шыць, ні віць, ні плесці, ні рабіць, іначай, казалі, дзеці і жывёла, якія павінны з’явіцца на свет, народзяцца пакалечаныя.

**13 студзеня**. Другая куцця ў праваслаўных вернікаў напярэдадні старога Новага года. Яе назва — «тоўстая» і «шчодрая». У народзе папярэджвалі: «Хто не пячэ бліноў перад Новым годам, у таго не будзе гладкай тлустай жывёлы, асабліва цялят».

На Шчадраца моладзь заўжды варажыла. Дзяўчаты абхоплівалі калы ў плоце і былі радыя, калі іх аказвалася ў пару; выпякалі штосьці з мукі і кармілі сабаку — чыё першае ён з'есць, тая дзяўчына раней за іншых і замуж пойдзе.

**14 студзеня**. Стары Новы год.

**18 студзеня**. Трэцяя (посная) куцця ў праваслаўных. Лічылася, што той, хто посціць напярэдадні свята Вадохрышча, і ўвесь год не з'есць нічога нячыстага ў стравах. Пасля заканчэння галоднай куцці сена, што ляжала на працягу двух калядных тыдняў, прыбіралася са стала і заносілася каровам, каб палепшыць і паскорыць іх малако, а заадно і засцерагчы ад сурокаў ведзьмы.

**19 студзеня**. Вадохрышча — апошняе свята каляднага цыкла: «Святое Хрышчэнне — і Калядам прашчэнне». У гэты дзень асвячаецца вада, якая затым выкарыстоўваецца пры розных бытавых выпадках і здарэннях. Напрыклад, яе даюць выпіць хвораму, ёю апырскваюць новую хату перад тым, як засяліцца, і вуллі, каб лепш вяліся пчолы; хрышчэнскай вадою асвячалі здавён поле перад сяўбою, труну, перш чым пакласці туды нябожчыка.

**20 студзеня.** Адзначаецца памяць святога прарока Іаана Хрысціцеля.

**25 студзеня**. Таццянін дзень. Свята студэнтаў. «На Таццяну звычайна бывае мароз. Сонечна — рана прыляцяць птушкі з выраю. Ідзе снег — дажджлівае лета».

**31 студзеня**. Дзень Апанаса. Лічыўся паловаю зімы ў дачыненні да назапашанага для хатняй скаціны корму. Калі яго выкарыстана палова, селяніну можна спакойна чакаць першага веснавога выпасу. Калі ж заставалася меней — трэба было карміць больш ашчадна. Апанаса называлі абаронцам жывёлы ад маразоў. Па надвор'ю вылічвалі пачатак надыходу цяпла і палявога сезона: раз на Апанаса завіруха — трэба чакаць працяглай вясны, з-за якой усе запасы з пуняў павымятаеш. Заканчваўся самы халодны месяц зімы, і народная прыказка папярэджвала: «Хавай нос у Апанасаўскі мароз!»

Аўтар: Самайловіч Вікторыя, 7 клас

